БЕЛАРУСКАЯ
РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Матка, атрымаўшая прэмію за правільнае выхаванье дзіцяці па парадах консультацыі.

№ 10

Толькі краіна Саветаў — краіна сацыялістычнага будаўніцтва — клапоціцца аб здаровым пакаленьні працоўных.

МАЙ 1929 г.

Гутарка з дэлегаткамі (6-ая).

(Камсамол і піонэррух на вёсцы).

— Сёньня і моладзь наша нешта на дэлегацкі сход прышла,—заўважыла Ганна.

— Бо сёньня гутарка будзе аб тым, як дэлегаткі павінны дапамагчы камсамолу і піонэрам,—адгукнулася некалькі дзяўчат разам.

— Дапамагчы...—надта прыткія вы. Вось толькі тое і ведаеце—прыгаць як козы,—накінулася старая Настуля. Яшчэ з яйца ня вылупіліся, а ўжо старых нас вучыць хочаце.

— Праўда, галубка, на вялікдзень нахварбавала я яечкі, а Домна мая кажа: мама, кіньце вы гэтыя забабоны, хадземце ў хату-чытальню, вечар будзе, пастаноўка, а ў царкву ня трэба. Я гэтак на яе—бязбожніца і такое мяне зло ўзяло. А яна:—мама, вы дэлегатка, актывістка,... разыйшлася Марыля.

— Вядома гэта так, мой хлапчук піонэрам, так усё-ж бачу я, што карысьць ёсьць. І лаяцца пачаў менш, устане раніцой—ложак сам убірае, мыецца. Я зьдзівілася. Добра, сынок, робіш.

— Гэта піонэрская дысцыпліна,—ганарова адказаў мне мой Васілёк,—з бліскучымі вачыма, радасная пахвалілася Матруна.

— Твой Васілёк можа і добры хлапчук, а мой Пятрусь піонэрам і нічога ня бачу я такога—хуліганіў і хуліганіць зараз. Вось пра сваю Гэльку-комсамолку нічога кепскага не скажу. Дзяўчына добрая, вучыцца ў горадзе на рабфаку, у летні адпачынак чыстату ў хаце наводзіць і на полі добра працуе, і гарод наш даглядае, і прачытае нам пра ўсякія навіны,—сказала Тэкля.

— Ну ёсьць добрыя і кепскія камсамольцы.

— Мы павінны сёньня з вамі абгаварыць пытаньне аб камсамолу і піонэрскім руху на вёсцы. Першымі памоцнікамі ў гэтай галіне павінны быць дэлегаткі,—пачаў сваю гутарку кіраўнік дэлегацкага сходу.

— Вось вы ў штодзённым жыцьці бачыце, што мы паступова перабудоўваем нашае жыцьцё. Пераходзім на шматпольле, організоўваем калгасы, саўгасы...

Нам шмат перашкаджае яшчэ ўгэтым наша цемра.

Мы павінны пабудаваць новую грамаду, якая ня будзе ведаць прыгнечаньня. Мы павінны выхаваць новых людзёй, здольных стварыць камуністычную грамаду. Гэтыя новыя людзі—нашы дзеці. Яны павінны быць здольнымі, дапамагчы арганізаваць нашае жыцьцё, змагацца з адмоўнымі бакамі ў нашым быце: п'янствам, курэньнем, з дрэннымі несяброўскімі адносінамі да дзяўчат і г. д.

Вось у нас яшчэ і зараз у КСМ, піонэрскіх атрадах дзяўчат мала. Напрыклад, па ўсёй Беларусі на 1 студзеня 1929 г. сяброў КСМ—**67181**, а дзяўчат—**15853**. Трэба ўцягнуць дзяўчат-батрачак, працоўных сялянак у школы і тэхнікумы, рабфакі і г. д. Новая жанчына не павінна пакутваць, як яе матка. І сьвядомыя маткі—дэлегаткі павінны гэта ўцяміць.

— Вось цётка Марыля скардзіцца на сваю Домну. А гэтая дзяўчына добрая, актыўная. Гэта праўда—у КСУ яна заўсёды беднату абараняе,—заўважыла Фёкла.

— Мы ведаем, што камсамольцы—моладзь зьяўляецца першым памоцнікам партыі ў правядзеньні каляктывізацыі вёскі. У Сьмілавіцкім раёне камсамольцы арганізавалі Камуну і бацькоў туды уцягнулі. Сярод арганізатараў адна дзяўчына была. Зараз іх некалькі. Камуна гэта прыкладам зьяўляецца для ўсёй вёскі. Такіх фактаў шмат,—загаварыў тав. Конанаў—сакратар ячэйкі КСМ. У нас амаль ва ўсіх раёнах Беларусі камсамольцамі арганізаваны калгасы. Вось у Жыткавіцкім раёне на Мазыршчыне 50 чалавек моладзі па ініцыятыве ячэйкі КСМ узяліся за выкарчоўку зямлі і арганізавалі калгас.

Ёсьць выпадкі, калі бацькі перашкаджаюць уступаць ў калгасы, асабліва дзяўчынам. Наогул дзяўчат у калгасах камсамольскіх надта мала.

У Жыткавіцкім раёне бацька да таго катаваў сваю дачку-камсамолку, пакуль яна ня прымушана была ўцячы ад яго. Зараз яна ў калгас уступіла.

— Вось пагэтаму мы і кажам, што маткі, асабліва дэлегаткі, павінны нам дапамагчы,—загаварыла камсамолка Маня, прыехаўшая з шэфамі з гораду.

— Мы ведаем, што ў нас яшчэ ёсьць шмат адмоўных бакоў.

— Нашы піонэры, зьмена—зьмене, таксама не заўсёды яшчэ добра працуюць. У нас яшчэ ёсьць шмат бяспритульных дзяцей, шмат дзяцей, а асабліва дзяўчат не ахоплены ні школамі, ні піонэрскімі атрадамі.

Нам трэба ведаць, што піонэры дапамагаюць маткам стварыць больш культурнае жыцьцё. Трэба, каб дэлегаткі дапамагалі камсамолу, піонэрам лепш організаваць моладзь, каб выхаваць добрых комуністых, здольных стварыць новае комуністычнае жыцьцё,—заключыў кіраўнік дэлегацкага сходу.

Мы, дэлегаткі, павінны быць першымі—заявілі ўсе.

Б. Дварэцкая.

ЗЬМЕСТ.

1) С удесятеренными силами за социалистическую стройку—С. Кремер. 2) IX Усебеларускі зьезд Саветаў. 3) „Іскра" і „Орт" Нарыс—Хмялеўская. 4) Портрэт. 5) Внимание летним площадкам—Ошерова. 6) К задачам ясельнай кампании—Граевская. 7) Бэрлінскія работніцы ў першамайскіх падзеях—М. Баравы. 8) Из писем работниц и селянак. 9) Сельская гаспадарка. 10) Што такое радыё. 11) Вывучайце нашы законы—Гарт. 12) Другая старонка вокладкі—гутарка з дэлегаткамі—Б. Дварэцкая. Лётарэйныя білеты і паштовая скрынка—4-ая старонка вокладкі.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45.
Тэлефон № 419.

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 месяц . . . 15 кап.
„ 3 „ . . . . 45 „
„ 6 „ . . . . 90 „
На год . . . 1 р. 80 „

№ 10 (60) | Май 1929 г. | № 10 (60)

С удесятеренными силами за социалистическую стройку.

29 апреля закончила свою работу 16-я конференция большевистской партии. Партийная конференция подвела итоги работы партии за последний год и наметила основные пути на дальнейший период.

Конференция мобилизовала всю партию—авангард рабочего класса и всех трудящихся вокруг очередных задач социалистического строительства и сплотила ее на ленинской программе, дав решительный отпор оппортунистам, стремящимся противопоставить линии партии свою оппортунистическую линию. Конференция обсудила следующие вопросы:

1. Пятилетний план развития народ. хозяйства.
2. Пути под'ема сельского хозяйства и налоговое облегчение середняка.
3. Итоги и ближайшие задачи борьбы с бюрократизмом и
4. О чистке и проверке членов и кандидатов ВКП(б).

Гигантские задачи поставлены историей перед трудящимися нашей страны.

Мы должны в возможно короткий срок догнать и перегнать в технически-экономическом отношении передовые капиталистические страны. Для этого нам необходимо быстрее двинуть вперед нашу индустрию и вместе с тем поднять сельское хозяйство, все больше разворачивая колхозы и совхозы и вводить в сельское хозяйство машинную тэхнику.

Для этого мы должны развернуть широчайшее движение масс за культуру, об'явить жестокий бой разгильдяйству, бюрократизму, волоките и бесхозяйственности, нужно все больше и больше укреплять социалистическое строительство и обороноспособность нашей страны, поднимать на активное участие и соревнование трудящихся в социалистической стройке.

Для того, чтобы выполнить эти задачи организованно, 16-й партконференцией утвержден пятилетний план хозяйственного и культурного строительства. Пятилетний план выдвинул на очередь грандиозные строительные задачи в промышленности и сельском хозяйстве.

64 миллиарда будет вложено за пятилетие в строительство фабрик, заводов, электростанций, жел. дорог, совхозов, колхозов. Наша социалистическая промышленность втрое превысит довоенный уровень. Все фабрики, заводы и шахты будут переведены на семичасовой рабочий день.

Пятилетний план, это план весьма напряженный, трудностей очень много потому, что необходимо быстрым темпом индустриализировать страну и поднять на большую высоту сельское хозяйство, реконструировать его, т.-е. перестроить на новый технической базе и социалистической основе, вытеснять при этом и усиленно наступать на капиталистические элементы в городе и деревне (нэпмана, кулака).

Наше пролетарское наступление на капиталистические элементы вызывает бешеный отпор и сопротивление наших классовых врагов. Кулак и нэпман не будут сдавать без боя своих позиций, кулаки оказывают сопротивление Советской власти в деле хлебозаготовок, в деле строительства колхозов и совхозов и пытается запугивать строителей новой деревни. Кулака и нэпмана поддерживают контр-революционеры, вредители, в промышленности, им содействует бюрократ в наших учреждениях.

Давление чуждых нам классов вызвало колебания и шатания в отдельных прослойках трудящихся и породило оппортунистический правый уклон в рядах Коммунистической партии. Только, преодолев шатания и колебания в своих рядах, только решительно ударив по правому уклону, Компартия и пролетариат сумеют сломить сопротивление классовых врагов и выполнить пятилетний план строительства социализма.

Ленинская партия смело ведет в бой за социализм колонны рабочего класса. На 16-й партконференции партия дала решительный отпор правым уклонистам, ясно установила перспективы и очередные задачи, стоящие на пути социалистического строительства.

С громадным единодушием сплотилась конференция вокруг генеральной линии партии, вокруг своего Ленинского ЦК. Под руководством Ленинской партии широчайшие массы трудящихся будут строить и построят социализм в нашей стране и во всем мире. Под руководством авангарда пролетариата Коммунистической партии и его Ленинского ЦК возьмемся с удесятеренными силами за социалистическую стройку.

Кремер.

Старшыня ЦВК т. Чарвякоў.

Няхай жыве сацыялістычнае спаборніцтва, да якога заклікаў IX Усебеларускі Зьезд Саветаў працоўных гораду і вёскі, рабочых фабрык, заводаў, насельніцтва вёскі, калгасаў, саўгасаў, спаборніцтва паміж горадам і вёскаю, паміж рабочымі і сялянствам, паміж асобнымі насельнымі пунктамі, паміж асобнымі гаспадарчымі адзінкамі.

(З прамовы тав. Чарвякова на Зьезьдзе).

Дэлегатка Зьезду—калгасьніца Бабруйскай акругі.

Таварышы! IX Усебеларускі Зьезд Саветаў пачынае працу праз 10 год пасьля I Усебеларускага Зьезду Саветаў, які адбыўся ў сакавіку 1919 г.

Мы павінны разгарнуць шырокі рух мас за культуру, мы павінны зьнішчыць безгаспадарчасьць, валакіту і бюракратызм.

(З прамовы т. Чарвякова на Зьезьдзе).

Дэлегаткі IX Зьезду Саветаў БССР.

Толькі пры сьвядомасьці мас, пры актыўным удзеле ў працы і барацьбе гэтых мас, мы зможам канчаткова перамагчы тыя цяжкасьці, якія сустракаем на нашым шляху ў вырашэньні задач па індустрыялізацыі краіны і перабудове сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва.

(З прамовы т. Чарвякова на Зьезьдзе).



Першамайская дэмонстрацыя ў Менску.

МЫ ПАВІННЫ ПАВЕСЬЦІ ДАЛЕЙШАЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ НА КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЭНТЫ.



Першамайскі парад у. Менску.

Мы павінны перамагчы капіталістычныя элемэнты ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы.

Мы павінны няўхільна ўмацаваць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

„ІСКРА“ і „ОРТ“.

Сёньні Дняпро надзвычайна вялікі. Талы сьнег радзіў соткі малых спрытных раўчакоў, якія сьпяшаюць з веснавым прывітаньнем к дзядульцы-Дняпру. Магутная вясна націскае на рэшткі зімы, таму Дняпро сёньні вельмі вясёлы. Ён падслухаў песьню птушак: „Кра-са-вік, кра-са-вік“—наперабой шчабечуць яны, ніжучы паветра над берагам. Гэта абудзіла ў старым дзіцячае натхненьне. Дняпро наморшчыў бровы, пасьля мякка бархатна зарагатаў і з пэўнай рашучай адвагай ляснуў хваляй аб бераг, аб апошнюю крыжыню, усё наўкола засыпаў іскрыстымі брызгамі.

Так Дняпро сьвяткаваў перамогу вясны. Пасьля ён заспакоіўся і ў дванаццаты раз пачаў шаптаць казку-праўду аб тым, як калісьці берагам гэтым валадаў некі пан Крывашэйн. Тут у Дняпро пазіралі—яго фабрыка папяровая і маёнтак.

Гэта было раней. А зараз...

* * *

Мы нядаўна пакінулі папяровую фабрыку „Спартак“. Работніцы гаварылі аб вытворчай дысцыпліне, аб ясьлях на 40 дзяцей, якія працуюць пры фабрыцы, аб клюбе рабочых, які памяшчаецца ў былых галоўных палацах пана. Успаміналі работніцу—Даргіс, яе нядаўна фабрыка вылучыла старшынёю Шклоўскага Гарсавету.

Да фабрыкі прытуліўся яўрэйскі нацыянальны калгас „Іскра“ (на зямлі таго-ж пана).

На ганку дзяўчынка гадоў пяці.

— А дзе старшыня каляктыва?—запыталі мы наўгад у малое.

Правяла да старшыні. Ведаюць яго нават 5-ігадовыя.

— Вы да каго?—пытае жанчына смуглявая, сярэдніх гадоў.

Мы адказалі.

— Старшыня зараз заняты на гаспадарцы, а я—сябра праўленьня. Сядайце,—ветла запрасіла т. Нахама Крычаўская.

Невялічкі пакой, у ім жыве сям'я з 8 чалавек. А чысьценька, падлога—хоць кашу кладзі, нідзе ні пылінкі. Суседзі ўбачылі гасьцей—пазьбіраліся ў хату. Гутарку павялі аб жыцьці і гаспадарцы калгасу.

Цяперашні калгас „Іскра“ мае менш 2-х гадоў з дню свайго нараджэньня. Раней тут таксама быў калгас, але ў ім заселі людзі, якія толькі раскідалі гаспадарку. Таму ў 1927 годзе разагналі нядбайнікаў і арганізавалі новы каляктыў.

Зараз „Іскра“ аб'яднае 23 яўрэйскіх сям'і з 97 чалавек.

Цяжка было спачатку: зломкі замест машын, адна каморка—усё памяшканьне, адна карова. Па паўшклянцы малако дзялілі.

А зараз ня тое.—Хоць самі пакуль што ня вельмі ў дастатках жывем: і цесна, і з сродкамі туга, але ўся наша ўвага на тое, каб больш умацаваць гаспадарку. Зямлі ў нас—пахаці—135 дзесяцін, ды 37 сенажаці. Севазварот 10-ціпалёвы. Маем 2 прадпрыемства: маслабойня і аўсянка.



Ёсьць у калгасе жняярка, снапавязалка, малатарня, 2 машыны, што бульбу капаюць. А галоўны гонар калгасу „Іскры“—гэта стада.

— Ды што там казаць, хадзем, самі пабачыце тое, што мы набылі,—прапанавала таварыш Нахама. А ў самой вочы так і блішчаць, твар шчасьлівы ведаючай гаспадыні-сялянкі. Яна нацягнула кажушок, павяла нас па хлявам. З намі разам яшчэ некалькі калгасьніц. Яны цёпла, як маці аб любым дзіцяці, кажуць нам:

— Вясною да нас прыяжджайце, мы ўсе як адна выйдзем на поле. А вось і стада.

Праўда, ёсьць чым пахваліцца: коні як люстра, дагледжаны ўдала. А 60 малочных сытых кароў усе ў радочак каля „дацкіх кармушак“. Во дзе стада, во дзе багацьце.

У хлявах чыста, дзьверы насьцеж, мякка паслана, у столі лямпачка электрычная.

А вось і цялятнік. 15 лепшых цёлак сёлета на гадоўлю пакінулі. Цялята гэтага году, а выглядаюць, як выпусткі.

— Астатнія лепшыя цялята разьбіраюць на гадоўлю сяляне. Наогул мы з вёскаю дружна жывем. Асабліва-ж нам фабрыка дапамагае. Папсуецца машына—фабрыка ў дапамогу: тут і сьлесар, і токар, розныя станкі.

— Во нашы посьпехі. Бачыце, як гаспадарым! А хто ўздумае грызьціся—у лапы возьмем і скажам: „Інтарэсы каляктыва вышэй за ўсё“. Кожны з нас заўжды адчувае, што галоўная мэта—узьняць гаспадарку. Кепска толькі, што аграном у нас рэдкі госьць. Ужо паўгода мы просім прыслаць аграномаў, правесьці гутаркі па розным галінам гаспадаркі, але пакуль што не прыяжджалі. Мабыць і сеяць прыдзецца так.

Гэта „Іскра“. А вось другі яўрэйскі калгас „ОРТ“ у Магілеўскай акрузе. Тут таксама калісьці быў маёнтак, пасьля стаў саўгас. Але ўрэшце на высмактаных землях калгас утварыўся. Зараз „ОРТ“ аб'яднае 14 сямей—70 чалавек. Зямлі—100 гэктараў, 40—сенажаці, малочная стада ў 54 галавы, коней—14.

Пяты год існуе калгас. Пачыналі таксама з пустым рукамі. Вельмі цяжка было разжывацца спачатку Ня ўсё ладна было: некаторыя сябры бунтавалі, шкодзілі працы. Прышлося выключыць іх.

І зараз праўда, ня ўсе аднолькава пазвыкалі да працы. Вось таварыш Мішкіна не прапускае ніводнага рабочага дню, разам з усімі на полі, у гародзе, ня гледзячы на тое, што мае 3-е малагодніх дзяцей.

Гарцман нестаміма спрытна на полі. Яна нам расказала, што некаторыя жанчыны самі ад працы хаваюцца і дзяўчат падвучаюць, каб ня ішлі працаваць.

А Ліпоўская крыху лянуецца, усю віну складае на дзіця, але справа ня ў гэтым.

— Вось зазірніце ўлетку да нас, калі выйдзем усе разам на поле. Нават люба было пазіраць, як мы ўсе жанчыны гной у поле вазілі. Зараз наш лёзунг: „Ня будзем нікога на працу наймаць". Самі з рукамі—паробім,—з разружаваным тварам кажа т. Мішкіна.

Два нацыянальных каляктывы—„ОРТ" і „Іскра". Гэта прыклад сапраўдны таго, што працоўныя яўрэі, якіх царскі ўрад прымушаў многа год блукацца, шукаць па сьвету прытулку, не падпускаў да зямлі, зараз каляктыўныя гаспадаркі будуюць. Нага-ў-ногу з усімі працоўнымі дапамагаюць умацаваньню гаспадаркі краіны Саветаў.

Ці толькі-ж над гэтым працуюць яны. Зірнем на быт у калгасах.

У „ОРЦЕ" ёсьць камсамольская ячэйка, 9 камсамольцаў, сярод іх 5 дзяўчат. Усе ў калгасах пісьменныя. Парашылі выпісаць часопісь „Беларуская работніца і сялянка", уголас чытаць яе, разьбіраць, пісаць допісы. Сход жанчын „ОРТ'а" парашыў ясьлі арганізаваць на ўласныя сродкі, каб усе жанчыны маглі выйсьці на поле. У калгасе „Іскра" парашылі працаваць у дні „пасхі". У „ОРЦ'е" камсамольцы парашылі на „пасху" арганізаваць каляктыўнае харчаваньне, з хлебам, без кавалка мацы. А тав. Мішкіна ўнесла прапанову:

— Трэба назаўсёды каляктыўнае харчаваньне наладзіць, будзе вальней нам, зручней працаваць у гаспадарцы.

— Мы не павінны жыць у брудзе; трэба, каб парадкі ў нашых хатах былі прыкладам для акаляючых сялянак,—на сходзе казалі калгасьніцы.

Вось чым жывуць сго шэсьцьдзесят тры каляктывісты „Іскры" і „ОРТ'а": упартай працай па падняцьцю гаспадаркі, думкай аб пабудове новага здаровага быту.

* * *

Хай шэпча Дняпро сваю казку. Хай апавядае малым, тым, хто ня бачыў зьдзекаў, пакуты, аб далёкім, беззваротна разьбітым мінулым.

Сумна-жудаснай казкай здаецца малым апавяданьне аб колішніх днях.

Таму палошчацца Дняпро ў берагах ціха, ціха, пакуль подых веснавога ветра зноў ня прымусіць вясёла па-дзіцячы сьмяяцца і бадзёра песьню пяяць.

В. Хмялеўская.

Магілеўская акр.



Дом Культуры Менску ў час IX Зьезду Саветаў.

Марыля зьнянацку зірнула на свайго суседа. Мільганула думка—а вось каб зараз ён падышоў ласкава, як маленькую, распытаў, суцешыў. Ён-жа перш тады, як заплаканая, усхвалёваная ў вагон прыбегла, так спагадліва пільна прыглядаўся. І такі сур'ёзны, відаць, вучоны гэты сусед, бач, акуляры на носе і газэту чытае.

І чаму гэта людзі друг друга незнаёмымі—чужымі лічуць, хоць яна і была на гуце сваёй актывістка, а вось гэтага ўцяміць ніяк ня можа.

Хацелася думаць далей, успомніла Васіля. Зноў клубок пякучы пад глотку падкаціўся, усьміхнулася мімаволі і сьляза буйная, бліскучая па румяных шчакох пакацілася.

Пасьля зьнячэўку стома зрабавала. Сьцежалелыя павекі бы волавам набраклі і ніяк іх не падняць. Хацела яшчэ раз на суседа зірнуць, а мо' расказаць, паскардзіцца на крыўду, але сон перамог, ахутаў млявым забыцьцём.

І сьнілася Марыльцы мінулае.

... Вёска Зарэчча прыгожым паўколам расьцягнулася паўз абодвы берагі Сьвіслачы.

Сьвіслач там серабрыстай стужкаю між поплыву зялёнага віецца. Выйдзеш раніцою набасанаж, калі раса яшчэ не апала, ды пэрламісьлязінкамі на лісткох зялёных, кветках пярэстых блішчыць. Глянеш навокала і нават і на сэрцы пасьвятлее.

У небе высока жаўранка заліваецца, над вухам чмель прагудзіць, а вось і стрэлка скрыдалкамі пэрламутнымі нізка, нізка ў люстра бліскучае зазірне.

Завіхаецца Марылька з палатном ля ракі, дружна пранікам яго выкалачвае, а пасьля расьцеле дарожкамі даўгімі—няхай беліцца.

Скіне андарак ды сарочку, косы пад хусту запхне і з разьбегу ў раку кінецца.

Хвалі ласкочуць, сонца жартамі гарэзнымі—праменьнямі гарачымі пяшчоты дарыць, і так люба моцнаю мускулістаю рукою расьсякаць гэтыя хвалі, прыгаршчамі кідаць у сонца бліскучыя пырскі і бясконцу цешыцца хараством і маладосьцю.

Вось толькі часу няма.

Ужо праз хвіліну імчыцца Марылька ў хлеў—трэ' каровы падаіць, прачнецца гаспадыня—зноў сварку завядзе. Пад прывычнымі пальцамі шпарка ходзяць пакорлівыя сыскі. Белыя струменьні малака трынкаюць на дне бляшанай даёнкі, лёгкімі надзімкамі пеніцца яно там.

Дзесяць кароў—вось ты адна і парадкуйся з імі, дапамогі ніхто ня дасьць, а трэ' яшчэ і сьвіньням замясіць і курам зерня якога накідаць, ды ці пералічыш усю работу. Ад цямна да цямна працуй, беражы гаспадарскае дабро, а за гэта кожны толькі рыхтык аблаяць, пакпіць з парабчанкі бязроднай і дзе ратунку шукаць—невясёлыя думкі апанавалі Марыльку.

Раптам што гэта:

— Тр-гу, ту, гу, гу...

На ўсю вуліцу затрубіў Ігнаська—вясковы пастух, а сьледам за ім ля самага плетню празьвінеў вясёлы голас Васіля:

— Эй, Марылька, здарова была.

Марылька на хвіліну прыпынілася, хваля чырвані заліла асмуглы твар, грудзі і нават вушы. Нешта задзьвінькала і шпарка, шпарка закацілася сэрца.

— Ці не заспала ты, а мо' не даспала—што бы скамянела сядзіш. Эх і дзеўка з цябе - кроў з малаком, а на вячоркі і носу не пакажаш... Мяртвячына. Вось каб воля—разварушыў-бы я цябе...

Марылька правяла каровы, зьвярнулася і здакорлівай усьмешкай адказала:

— От, чаго захацеў, толькі і давай вам волю цяперака, ні на гэткую трапіў. Лепш-бы ты да Настасі крываногай пайшоў, або стрыжку якую з гораду пападзі, а ў нас з гэткімі парадкамі ня вельмі арудуй.

— Ды што ты, Марылька,—весела ўстрасануўшы чорнай капою кучаравых валасоў засупярэчыў Васіль.

— Ці не пра гэта я кажу. Вось ня жыцьцё мне аднаму. Забурліла кроў маладзецкая. Яшчэ летась спадабаў цябе. Спэцыяльна таму і ў сяло сакратаром пагадзіўся. Думаў мо'і выйдзе што. Ажэнімся. У горад паедзем. Ажна ты ня дзеўка быццам—ані пагуляць, ані пажартаваць з табою.

— Эх, Марылька, кажу я табе ня раз—кінь валэнду гэтую, пабярэмся—шчасьлівыя будзем. Ты-ж толькі зірні, хлопец я здаровы, дзеўкі гужам бегаюць, любую багатырку вазьму. Ды нашто яны мне? Марылька...—і Васіль моцна сьціснуў яе ў гарачых абнімках, сакавітыя вусны зьляпіў пацалунак.

А праз хвіліну Марылька перамагла сябе, вырвалася і ўся расчырванеўшыся прашаптала:

— Ды кінь ты разарацца тут. Бога пабойся. От гаспадыня пачуе, сораму не абярэшся.

— Ды ўжо-ж пайду, калі такая няміласьцівая—бога спалохалася, гэта таго самага, якога на справе і нямашака, што адно ў забабонах папоўскіх жыве. Так, пайду, бо бач падпасак куды падагнаўся, пад самы лес цяпер уздагон трэ... У мяне з ім справы ёсьць—у прафсаюз хоча, вось і ты-бы...

Марылька палахліва, як ад назойлівай мухі, адмахнулася рукою:

— Толькі гэтага ліха не хапае, хто мяне трымаць будзе? Ідзі ты лепш сваёй дарогаю.

Чорная пядзь валос сьлізганулася на вочы, Васіль порстка адкінуў яе:

— Упартая. Ну, што-ж... Будзе час—па адвячорку за агарод выйдзі. Там ля прысад чакаць буду.

Вось ужо за рог завярнуў, схаваўся з вачэй Васіль. Стужкаю празрыстаю з коміну суседняга дымок віецца.

Марылька падалася ў сенцы, не пасьпела дзьвераў адчыніць, а ёй насустрач тыграй разьюшанай гаспадыня:

— А, сволач паганая, з хлопцамі гуляць, шуры-муры разводзіць. На гаспадароў нагаварваць. А яны нам падатак, а яны нам штраф. Ах, ты погань акаяная. Я та думаю, чаго гэты прахвост-краснамолавец бадзяецца кругом маёй хаты. А цяперака ты ўжо не падвядзеш, падліза ты, гадзюка смаленая. Гэта-ж ён павыпытвае,

у лісты пазапісвае, а нам плаці. А каб вас немач, каб вам...

— Ды я, пані, нічога, гэта ён проста спадабаў мяне"... саромліва перабіраючы ў пальцах акраешак хвартуха апраўдывалася Марылька.

— Цябе?—Рыла ты нікчэмнае, падцірала. Насьмяяўся, а яна тут—спадабаў. Ды каб ты не даждала,

Эх, Марылька, кажу я табе ні раз кінь валэнду гэтую...

ён любую гаспадарскую дачку возьме, а яна галадранка тая, а людцы-ж вы мае, дачакаліся. Вон з маёй хаты—кажу. Каб твайго сёнячы і сьледу ня было. От табе пашпарт, ідзі на ўсе чатыры бакі. І, павярнуўшыся грузным задам, гаспадыня паплыла ў пакоі.

Зьбянтэжаная, згубленая стаяла Марылька. Сьлезы, як боб, сыпаліся на буйны жвір. На сэрцы ўскіпала крыўда і горач, муціла думка—завошта?.. і калі не знайшла адказу, раптам зьявілася гострая нянавісьць—агіда да гэтае гаспадыні, якая выматала ўсе сілы, якая так бязьлітасна глуміла маладосьць.

А дзе выйсьце шукаць, пайсьці ў сельсавет расказаць усё толкам, дапамогу прасіць? Ды там-жа Васіль, што яму сказаць праўду? Ой не, нельга праўду казаць, зноў будзе кпіць, несьвядомым элемэнтам назаве. А ліха яго ведае, што гэта за „элімэнты", толькі-ж сорамна, крыўдна неяк за неуцтва сваё. Вось можа да Ганны забегчы, з ёю параіцца, яна-ж бывалая, у горадзе жыла. Глянула наўкола. За дзьвярмі лаянка, гаспадыня ня сунімалася. Доўга ня думаючы, перавязала хусту і сьпешкам пабегла да крывенечкай Ганнавай хаты. Вось і знаёмы пляцень. Ля маленечкіх вокнаў, бы сівыя космы старой бабулькі, зьвісаюць з страхі каласы счарнелай саломы. На ганку Ганна завіхаецца—малако цэдзіць.

— Добры дзень у хату!..

Выпрасталася стройная, з маладым здаровым румянцам, пазнала і, ветла ўсьміхаючыся, прывіталася:

— А, Марылька, здарова, сястрыца. Вось нарэшце надумалася, зайшла, а то цалюткі дзень на дармаедаў сваіх працуеш, яны, бач, гладчэюць, а ты вось бледнаякая ды сіняцы пад вачыма.

Сьцёрла хвартухам лаўку.

Вось сюды сядай, пагаворым, работа мая не ўцячэ, ведаешжа—сама сабе гаспадыня.

Марылька зноў мімаволі глянула навокал. Хоць бедна, але чысьценька, прытульна ўсюды і, галоўнае, ніхто над каркам тваім не стаіць, ня прыганяе. Зайздрасьць казытнула, а пасьля сорамна зрабілася і тады больш пільна да гаворкі Ганнавай прыслухалася.

— А ўсё-ж такі сумую я па гораду. Там табе і кіно і тэатры, ды сходы розныя. А ў нас зьбіраешся на дэлегацкі сход, прыдуць два, тры чалавелі, той дзяцей няма з кім пакінуць, тую гаспадыня ня пушчае, а каб правы свае адстаяць у прафсаюз запісацца—і ня блізка. Вось ты і рабі што хочаш.

— Ганулька, а я да цябе за парадай. Будзь ласкава, навучы, што рабіць...—гаспадыня... мяне... прагнала,—ужо праз сьлёзы скончыла Марыля.

— Прагнала? Ды я-ж бы на яе, на тыгру тую, век працаваць не згадзілася. І табе ўжо ня раз казала: вазьміся за розум—запішыся ў прафсаюз, там, глядзіш, колектыў які арганізуем, а цяперака ў сельсавет бяжы, якое права мае распараджацца гэтак.

— Не, Ганна, ня жыцьцё мне ўжо тут, надумалася я—у горад паеду, мо' там работу якую знайду, сьвету хочацца пабачыць. Зноў-жа ў сельсавет не пайду—Васіль там, сорамна будзе.

Доўга спрачалася, угаварвала яе Ганна, нават раззлавалася пад канец:

— Ёй хоць у лоб страляй, а яна сваё права правіць. Ну, што-ж гарбатага магіла справіць. Едзь у горад, адрас сястры дам. Толькі-ж ці лёгка думаеш работу там знайсьці, ці сваіх рабочых рук не хапае. Мо, і пашанцуе, ведама, молада-зелена. Сама гэткаю была я. Хадзем у хату.

Праз некалькі хвілін Марылька сьпяшліва ішла да дому, сьпяшліва зьбірала рэчы. Гаспадыня пазірала воўкам, не загаварвала.

А калі сонца вогненым дзіскам скацікалася за гару, калі апошнія праменьні залацілі, губляліся ў сіня-лілёвых хвалях Сьвіслачы, Марылька з клумкам на плячох выйшла да прысад. Сёньня ўвечары Сьцяпян Канцавы абяцаў падвезьці яе да Менску.

Вось яны знаёмыя кляновыя прысады—варта юнацкіх пяшчотаў, юнацкага каханьня.

Так сягоньня, мо' ў апошні раз,

А, сволачь паганая, з хлопцамі гуляць.

на расстаньне бачыць яна свайго Васілька. Ён ня ведае, не чакае гэтага... Марылька ня скажа яму завошта выгнала яе гаспадыня. Бо... мо' і сапраўды ён толькі пасьмяўся над ёю, ведае, няма каму бараніць—адна яна сірата круглая, мо' і сапраўды не кахае.

(*Працяг будзе*).

Гадуйце здаровых дзяцей

ВНИМАНИЕ ЛЕТНИМ ПЛОЩАДКАМ.

Наступает лето. Солнышко ярче пригревает оживающую природу и на улицу начинают выползать ребятишки. Кишат ими скверы, бульвары, а еще больше—пыльные и грязные улицы, дворы и базары. Матери в постоянной тревоге: вот-вот попадет ее ребенок под автобус, лошадь или в речку.

Но никакими силами не удержать их дома—на улице так хорошо.. А детям воздух и солнце необходимы.

Необходимо, чтобы и сами родители и профсоюзы, кооперация, комитеты взаимопомощи, шефы и целый ряд других общественных организаций немедленно занялись вопросом создания здоровой нормальной обстановки на лето для ребят города и деревни.

Из каждой сотни детей от 3-х до 8 лет только 1 находится в детском саду, а 99 не попадают туда, т. к. садов очень мало. Государство не имеет средств для того, чтобы открывать много новых садов, и этим делом должны заняться сами родители и общественные организации. Но если детский сад—учреждение не очень дешевое—требует специального помещения, то летняя площадка стоит не дорого, ее можно легко организовать.

Что нужно для организации летней площадки?

Помещением как в городе, так и в деревне может служить школа, а там, где ее нет—навес в саду.

Оборудование—самое простое; низенькие скамеечки и столики, которые могут сделать сами родители при помощи комсомольцев и пионеров. На питание детей должны дать сами родители. Оплата воспитательниц и кухарки составляет около 300 рублей для города и 200 рублей для деревни. Тут необходимо помощь профсоюзов, кооперации, шефов и других общественных организаций. Там, где возможно, нужно организовать спектакли, концерты и другие мероприятия через самодеятельность делегаток женотдела.

О пользе площадок и их громадном значении для воспитания детей говорит рост последних из года в год (в Минском округе в 1927 году было 68 площадок, а в 1928—105). Это далеко не достаточно. Нужно, чтобы сами работницы и крестьянки и соответствующие общественные организации в большей мере занялись облегчением труда и быта работниц и крестьянок, путем расширения сети детучреждений. В этом году пока только союз сельско-хозяйственных и лесных рабочих и комиссия помдет уже приступили практически к подготовке летних площадок. Остальные профсоюзные организации, ЖАКТ'ы, кооперация пока не торопятся. Лето уже пришло. Нужно немедленно взяться за это дело. Сами родители могут и должны взять на себя инициативу организации площадок на самооплату и добиваться немедленно развертывания работы по организации площадок.

Надо взяться за дело, пока не поздно.

Ошерова.

К задачам ясельнай кампанii.

Усё шырэй і шырэй разгортваецца сетка летніх ясляў па БССР. Усё больш і больш сялянскіх дзяцей ахопліваюць летнія ясьлі. Так, у 1927 г. было—215, у 1928 г.—295 ясьляў, якія ахапілі каля—9000 дзяцей. Упяршыню ў 1928 г. былі разгорнуты ясьлі ў 39 калгасах і саўгасах. Некалькі ясьляў было ў нацыянальных сельсаветах.

Наркамаховы здароўя адпусьціў у гэтым годзе 25.000 руб. на організацыю летніх палявых ясьляў, але гэта надта мала, трэба каб і грамадзкія організацыі, КСУ, коопэрацыя, Чырвоны крыж і іншыя дапамаглі ў гэтай справе. У нас ужо ёсьць вопыт, калі на ўтрыманьне дзяцей даюць бацькі, а на абслугоўваньне—ахматмлад альбо грамадзкія організацыі. Трэба гэты вопыт пашыраць. Улічывая вялікую карысьць ясьляў, неабходна шырэй разгарнуць сетку іх у гэтым годзе. Трэба, каб гэтая дапамога насіла сыстэматычны характар, бо калі продуктаў не хапае, гэта адбіваецца дрэнна на дзецях. Для таго, каб ясьлі працавалі добра, неабходна мець падрыхтаваных працаўнікоў, знаёмых з умовамі сялянскага жыцьця. У гэтым годзе, як і ў мінулым, мы ва ўсіх акруговых гарадох праводзім курсы працоўнікоў летніх ясьляў з сялянак, батрачак, саўгасьніц і калгасьніц.

У саўгасах і калгасах у гэтым годзе будуць працаваць ясьлі-сады—установа, якая ахапляе дзяцей да 6 год. Гэта вельмі карысна для сялянак, але неабходна зрабіць, каб дзеці да 3 год і дзеці з 3 да 6 г. былі ў асобных пакоях—гэта дасьць менш захворваемасьці сярод дзяцей. Ясьлі зьяўляюцца і школай грамадзкасьці для сялянак. Гэта ажыцьцяўляецца праз мацярынскія камітэты пры ясьлях. Падбор дзяцей, організацыя матар'яльнай дапамогі ясьлям, організацыя мацярэй для санасьветнай працы—усё гэта задачы мацярынскага камітэту. Ясьлі патрабуюць увагі да сабе з боку ўсіх грамадзкіх організацый і самога насельніцтва. Кожная працоўная сялянка павінна дапамагаць працы ясьляў.

Трэба тэрмінова ўзяцца за організацыю палявых ясьляў. Грамадзкія організацыі, бацькі—за працу.

Граеўская.

Да здравствуют пролетарки Германии, стой

Бэрлінскія работніцы ў першамайскіх падзеях.

У арганізаваным першамайскім пратэсьце бэрлінскага пралетарыяту супроць капіталістычнага ладу ў Нямеччыне работніцы прынялі самы актыўны



Кровавые майские дни в Берлине.
Полиция разгоняет и арестовывает демонстрантов.

і гарачы ўдзел. Ува многіх мясцох работніцы адыгрывалі нават арганізатарскую ролю, першыя фармавалі дэманстрацыі, абаранялі ад захопу паліцыяй чырвоныя сьцягі і г. д. Паданыя ніжэй факты зьяўляюцца няпоўнай зводкай, паводле нямецкіх газэт, удзелу работніц у першамайскіх падзеях у Бэрліне.

У Шёнбэргу—аднэй з частак Бэрліну—група рэвалюцыйна-настроеных рабочых сабралася каля рынку, але дэманстрацыя яшчэ не пачыналася. Раптам чатыры работніцы выступілі наперад. Адна з іх разгарнула чырвоны сьцяг. У некалькі хвілін сфармавалася стройная дэманстрацыя на чале з адважнымі работніцамі. Не прайшлі дэманстранты і некалькі кварталаў, як насустрэч ім паказаліся паліцэйскія самаходы, якія з усяго разгону ехалі проста на дэманстрацыю. Работніцы з чырвоным сьцягам не адступілі ні на крок. Паліцэйскія спынілі самаходы і з гумовымі палкамі накінуліся на дэманстрантаў. Дзьве работніцы былі арыштаваны.

У Марыендорф-Тэмпэльгофе (адным з прадмесьцяў Бэрліну) паліцыя з самай раніцы была ўжо расстаўлена па вуліцах і не давала фармавацца дэманстрацыям. Рабочыя і работніцы сабраліся ў закрытых памяшканьнях і групамі сталі выходзіць на тратуары. Раптам па сыгналу яны з тратуараў зыйшлі на сярэдзіну вуліцы і запяялі „Інтэрнацыянал“. Такое раптоўнае сфармаваньне дэманстрацыі прывяло паліцыю на кароткі час у замяшаньне. Але падае каманда і паліцэйскія з гумовымі палкамі накідваюцца на безабаронных рабочых і работніц. У гэтай дэманстрацыі шмат работніц былі ў самых першых радох. Калі дэманстрацыя была ўжо разагнана, адна маладая работніца выскачыла на сярэдзіну вуліцы з выгукамі: „Наперад, на дэманстрацыю, на вуліцу“. Вакол яе зноў сабралася шмат дэманстрантаў. Зноў былі пушчаны гумовыя палкі паліцэйскіх. Работніца была арыштавана, але нават акружаная паліцыяй яна крычала: „Няхай жыве 1-ае мая! Няхай жыве Камуністычная партыя“.

У Ліхтэнбэргу работніцы сталі на чале паходу. Калі яны разгарнулі чырвоны сьцяг, хутка за імі выросла вялікая калёна дэманстрантаў.

У цэнтры гораду работніцы ўтварылі асобную групу ў агульнай дэманстрацыі са сьцягам, які меў надпіс: „Роўная зарплата за роўную работу“. Цэргібэляўская паліцыя, разганяючы дэманстрацыю, асабліва старалася адабраць ад жанчын іх сьцяг, але бяз посьпеху. Шмат работніц было пабіта гумавымі палкамі, шмат арыштавана, але сьцяг у паліцэйскія рукі не папаў.

У Кёпэпніку работніцы таксама ішлі на чале паходу з чырвоным сьцягам. Калі паліцыя са зброяй напагатове перагарадзіла дарогу, работніцы не адступілі. З іх радоў панесьліся выгукі: „Страляйце, калі маеце адвагу на гэта“. Паліцэйскія спачатку ня ведалі, што рабіць, а потым накінуліся на жанчын з гумавымі палкамі.

У Вэдынгу, адным з найвялікшых рабочых кварталу Бэрліну, удзел работніц быў асабліва шматлікім. Тысячы работніц ішлі ў калёнах за чырвоным сьцягам. Пробы паліцыі захапіць яго скончыліся няўдачай. Тагды паліцыя нацкавала на работніц вялікіх паліцэйскіх сабак. Шмат удзельніц дэманстрацыі было пакусана. Калі пачалося будаваньне першых барыкад, жанчыны таксама прынялі ў гэтым актыўны ўдзел. У далейшым, калі паліцыя ад гумавых палак перайшла да кулямётаў і бронямашын, калі пачалі падаць забітыя і параненыя, дык работніцы горача ўзяліся за наладжаньне рабочае санітарнае дапамогі. Часта пад градам куль зьяўляліся яны каля барыкад, каб забраць параненага і, адцягнуўшы яго пад прыкрыцьце выступу якое-небудзь камяніцы, зрабіць першую перавязку.

Як абыходзіліся паліцэйскія з папаўшымі ў іх лапы арыштаванымі работніцамі, паказвае такое апавяданьне аднае маладой работніцы на старонках рабочых газэт.

„Я была на Аляксандраўскім пляцы. Раптам наяжджае паліцэйскі самаход. Бяз усякага папярэджаньня паліцэйскія з гумавымі палкамі накіну-

ко борющиеся под знаменем Коминтерна.

ліся на дэманстрантаў. Я атрымала два моцныя ўдары па галаве і ўпала бяспрытомная. На палі-



К кровавым первомайским событиям в Берлине.
В Нейкельне, в ночь со 2-го на 3-е мая. Полиция заняла баррикады.

цэйскім самаходзе, куды мяне перанесьлі, я прышла ў сябе. Вялікі цяжкі самаход быў запоўнены арыштаванымі. Усякі, хто пробаваў падняць уверх сьціснутую ў кулак руку (знак „Чырвонага саюзу франтавікоў"), няшчадна зьбіваўся гумавымі палкамі. У мяне кроў цякла з носа і рота, але тым ня менш я таксама падняла кулак. Пара моцных удароў—і я зноў упала ў бяспрытомнасьць. Усе арыштаваныя былі замкнёны ў бараках. Са мною сядзела каля 40 жанчын. Мы сьпявалі „Інтэрнацыянал" і крычалі: „Прэч Цэргібэлеўскую паліцыю". Раптам ускочыў паліцэйскі афіцэр і, наводзячы на нас рэвальвэр, пачаў лаяцца з апошніх слоў. І прыгразіў нам—калі не перастанем пяяць—перастраляць усіх. Позьнім вечарам пасьля праверкі дакумантаў мы былі адпушчаны да хаты".

На заўтра 2-га мая, у знак пратэсту супроць зьверскага абыходжаньня паліцыі з работніцамі, спынілі работу тры вялікія фабрыкі, на якіх працуюць амаль выключна жанчыны: сігарэтныя фабрыкі Манолі, Джозэці і Масары.

Першамайскія дні ў Бэрліне паказалі, што нямецкія работніцы гатовы ісьці ў рэвалюцыйнай барацьбе нага ў нагу з рабочымі да поўнае перамогі рэвалюцыі.

Міхась Баравы.

▼▼▼▼▼▼▼▼▼▼

БОЕВОЙ ПРИЗЫВ

(К работницам и крестьянкам)

Подруги, сестры, в трудный час
В свои ряды зовем мы вас,
Зовем борцов отважных, честных,
Работниц скромных и безвестных.
Силен противник, и трудна
Нас истомившая война.
Быть может, ждут еще нас беды,
И горечь слез, и тяжесть мук,
Но злым врагам из наших рук
Не вырвать знамени победы.
Враги усилили напор,
Они спешат. Спешат недаром:
Их тыл охвачен весь пожаром,
И срок настал с врагами спор
Решить одним стальным ударом.
Подруги, сестры, в трудный час
В ряды борцов зовем мы вас,
Отважных, бодрых, стойких, честных
Работниц стойких и безвестных.
Придут иные времена,
И будут новым поколеньем
Произноситься с умиленьем
Святые ваши имена.

Демьян Бедный.

На борьбу с разгильдяйством и рас критику миллионов

Как Бася „отреклась“ от старых обычаев.

Приближается пасха, надо мацу качать.

— Нет папа, я не пойду качаць мацу,—говорит Бася Соркина,—поезжай в Селец, найми несколько женщин, а то маме одной трудно будет справиться.

Маца испечена. Надо к пасхе квартиру убирать: белить, мыть.

— Если этого не сделаю я,—рассуждает Бася,—то придется матери возиться, а для нее это тяжело.

И активно взялась Бася за предпасхальную уборку. Закончив уборку, Бася взялась посуду кошеровать, потом „хомец“ выносить. В хлопотах незаметно и пасха наступила. А на пасху надо „пасхальное“ молоко доить:

— Нет, для матери это будет слишком тяжело.

Берет Бася „пасхальную“ мисочку, идет в сарай, доит „пасхальное“ молоко.

Все работы кончены. Наступило время первого „пасхального“ ужина. Но ведь если Бася не сядет ужинать, то придется матери самой весь ужин скушать, опять обидно для Баси и тяжело для матери..

Садится Бася за стол и ест „пасхальный“ ужин.

Вот как новая комсомолка—Бася отреклась от старого дурмана.

Зоркий.

Коллектив „ОРТ“,



... Если Бася не сядет ужинать—придется матери весь ужин скушать. Обидно для Баси—тяжело для матери.

Прэч падкулачнікаў.

Супроць сдачы хлеба ў чырвоны абоз на агульным сходзе вёскі Ратча выступіла сялянка *Жвалевіч П.*

— Я,—гаварыла яна,—у Талачыні на рынку па 7 руб. за пуд прадавала. Такім спэкулянтам ня мейсца сярод працоўнага сялянства.

Але-ж амаль увесь сход запісаўся ў чырвоны абоз.

в. Ратча, Аршаншчына. Селянін **Дрык Сяргей.**

Батрачка не спадабаецца.

У вёсцы Гурэц, Кашчынскага с/с многім не спадабаецца, што жанчыны ўзяліся за працу. Жанарганізатару Зьмітраку Дзенісавічу здалося, што дзяўчына-батрачка Агата Барашка цяжарная. Калі яна прышла на пасяджэньне Савету хаты-чытальні, як сябра гэтага Савету, дык Зьмітрок пачаў строіць кпіны.

Надзя Канапелькіна была абрана ў рэдкалегію насьценгазэты, цікавілася справай, пісала ў насьценгазэту, была абрана сябрам с/с, але не спадабалася яна сакратару ячэйкі—Волькі Дзянісевіч. Яна настаяла, каб Н. Канапелькіну Савет хаты-чытальні выкінуў з рэдкалегіі. Яе месца прызначылі настаўніцы, якая жыве за 10 кілём. і ў насьценгазэту нічога ня піша.

Заняткі з дэлегаткамі вядуцца вельмі кепска, а то склічуць дэлегатак, а жанкіраўнік ня зьявіцца. Такі падыход да жанчын адымае жаданьне працаваць.

Дэлегатка.

Кружок безбожников спит.

Миновали разных „сортов“ пасхи. И даже в это время наша ячейка не подумала провести антирелигиозную работу среди женщин Торгстроя.

А в групкоме числится кружок безбожников, который ничего не делает для того, чтобы организовать лекции, беседы, дать литературу соответствующую.

Нашему женорганизатору и парт'ячейке надо больше внимание обратить на этот участок работы.

Минск. **Дорский.**

Боремся с прогулами.

На фабрике „Спартак“ не искоренились еще прогулы, но все же их меньше чем бывало. В последнее время создались добровольные группы по борьбе с прогулами по цехам.

Прогульщица — Карповская Зина — работница Кокалирного цеха—жена секретаря Райкома комсомола, всячески старается подорвать эту работу. Вот такой факт: Карповская Зина присутствует 16 апреля на производственном вечере, а на завтра ее нет на работе. А когда председатель комиссии ее спрашивает, почему она не пришла на работу, она даже говорить не хочет и начинает его ругать и обзывать симулянтом.

У Карповской Зины не первый прогул, она все говорит, что ее ребенок был больной, и мастер ей всегда давал отдежуривать свои прогулы. Комиссия будет бороться с такими прогульщиками.

Делегатка.

Хлябанностью направим мощную самотрудящихся масс.

Союз защищает.

Здорово эксплоатировала гр-ка Марголина свою работницу. Ни в школу, ни на делегатское собрание не пускала. 20 марта, когда работница вернулась с делегатского собрания, она ее оставила ночевать на улице.

Местком предложил Марголиной уплатить работнице 40 руб. за неиспользованный отпуск и выходные дни. Марголина привлекается к судебной ответственности за клевету на работницу Тарасик о ее якобы плохом поведении.

Доброгост.

Чэрвень.

Ажыццяўляем пастановы Ўраду.

На адбыўшайся ў Чэрвені раённай нарадзе жанчын-грамадчыц прысутнічала 57 чалавек. Актыўна абгаварылі пытаньне аб падрыхтоўцы да вясновай сяўбы. Парашылі ўжываць розныя ўгнаеньні. 25 жанчын зьбіраюць попел. Толькі двое не ачысьцілі насеньне. Пастанавілі правесьці кантрактацыю ільну і хутчэй прыступіць да арганізацыі калгасаў і камун.

Лукашэвіч.

Гор. Чэрвень, Меншчына.

Мы выклікаем.

Дэлегаткі вёскі Раўнапольле арганізавалі гурток Чырвонага Крыжу. Зацікаўленасьць гэтым гуртком вельмі вялікая. Наведваюць амаль усе. Выклікаем дэлегатак Сьмілавіцкага раёну арганізаваць такія-ж гурткі.

М. Чабор.

Калгасы дапамагаюць.

Калгас імя Прышчэпава (в. Новыя Дарогі) дапамог прачысьціць насеньне 15 бядняцкім сем'ям. У першую чаргу ўдовам і чырвонаармейкам. Па ініцыятыве дэлегатак Жанаддзелу арганізаван вопытны агарод і птушкаводнае т-ва.

Ц. Хаіч.

Старыя Дарогі, Бабруйшчына.

Узварушыліся вясковыя дзяўчыны.

У вёсцы Ворсічах арганізаваўся лікпункт, запісалася 50 чал. Правялі суботнік па пагрузцы дроў на станцыі; зарабілі 25 руб. Набылі на гэтыя грошы прылады, Райвыканком прыслаў падручнікі і праца рэгулярна пашла. Лікпункт выключна амаль складаўся з дзяўчат. К выпуску лікпункта было 29 ч., з якіх добра скончылі 20 ч. Пры выпуске ўсе згадзіліся падпісацца на часопіс „Беларуская работніца і сялянка".

„Селькорка".

Бабруйскі раён.

На помощь детдомам.

В Быхове, Могилевского округа, есть второй детский дом, который был плохо материально обеспечен. Дети ходили оборванные и разутые.

5-й понтонный баталион взял шефство над домом. Купили бязи на 23 пары белья, а наша школа кройки и шитья сшила это белье. Мы также не отказываемся в дальнейшем помочь детдому, чем мы только сумеем.

Я думаю, что не только в Быхове имеются детдома, которые материально плохо обеспечены; нужно ближе связаться с детдомами, узнать их положение и помочь им.

Слушательница школы кройки и шитья
Могилев. им. 8-го марта **Малкина Маня.**

Піонэры праводзяць гутарку ў яўрэйскім калгасу.

Чым дапамагаюць нам шэфы.

Шчырую сувязь трымаюць з намі шэфы. Яны дапамаглі нам адчыніць хату-чытальню, у якой зьбіраюцца кожны вечар жанчыны ды чытаюць кнігі, газэты і г. д. Шэфы далі нам многа літаратуры і плякатаў. У вёсцы Раўнапольле шэф Марозаў праводзіў сход аб пасеўкампаніі і калектывізацыі. Жанчыны згадзіліся паступіць у калектывы. На наступным сходзе ўжо будуць запісваць у калектыў. У Раўнапольле шэфы нашы прывязьлі 4 драпака і 4 плуга. Як толькі прыедуць шэфы, так наша хата-чытальня паўнюсенька жанчын. Я пішу гэта праз „Бел. работніцу і сялянку" ад імя ўсіх нашых сялянак вёскі Раўнапольле, што яны шчыра дзякуюць шэфаў за іх работу.

М. Чабор.

ШТО ВЫЯВІЛІ Ў ЧАС КУЛЬТБЫТПАХОДУ.

Што мы знайшлі ў час паходу.

У больніцы няма ўціральнікаў у хворых і яны ўціраюцца простынямі. У кіпяцільні брудна. У пральні маецца сток для бруднай вады, але-ж ён ніколі не прачышчаецца, і вада застойваецца на падлозе; прачкі выцягваюць яе вёдрамі.

У радзільным пакоі маецца толькі адзін дзіцячы ложак, а ражэніц бывае некалькі і яны трымаюць у сваіх ложках малых рабят.

Зубны ўрач ходзіць у брудным халаце.

Чыста ў палатах больніцы і консультацыі.

У сталоўцы гарачых абедаў няма, а халодныя закускі і чай. Буфэт ад пасяціцеляй не адгарожаны і яны бруднымі рукамі бяруцца за яду. Сталы бяз кляёнак. Абрусы брудныя—мыюцца адзін раз у два тыдні.

Дрэнна абстаіць з правядзеньнем культпаходу на вёсцы, дэлегаткі яшчэ не раскачаліся.

Райжанорг Сенненскага раёну **Мітліна.**

Сенно.

Бярыце прыклад.

На вёсцы Бярэзіне, Людз. с/с, у гэтым годзе адчынілася школа. Вучацца пісьменнасьці 55 чал. Вёска раскінута амаль што на 10 вёрст. Каб больш пасьпяваць, яны вучацца ў нядзелю днём. Маецца вышывальны гурток, драматычны і харавы і працуюць у іх ахвотна. Бярыце прыклад з хутара Бярэзіны.

Людзянавічы. **Зарэцкая.**

Чэрвень.

Прышлі мы ў саюз сельгас. і лес. рабочых. Выявілі:—калі прыходзіць беспрацоўная і просіць працы, дык старшыня райкому рэкамэндуе тапіцца. Зараз гэты працаўнік зьняты з працы.

У яўрэйскай сямігодцы дзеці цэлы дзень сядзяць у сьпёртым паветры. Памяшканьне не праветрываецца. Ніводнай дзяўчыны няма ў сталярнай майстэрні.

Горш за ўсё пастаўлена санітарнае становішча ў больніцы. Вэнтылятары прарэзаны толькі ў аднэй раме вакна, паветра дрэннае. Хворыя плююць на падлогу. Ад плявацельніц ваняе. Санітарка працуе 12 гадзін, бо яна адна; гэта дрэнна адбіваецца на працы і на яе здароўі. Ёй прыходзіцца даглядаць адначасова за сухотнымі, опэрацыйнымі, ражэніцамі і дзяцьмі. Няма сталых часоў наведваньня, бывае, што наведвацелей больш, чым хворых.

Нашы прапановы: папоўніць сталярную майстэрню дзяўчатамі. Эканомкамісіі саюзу ўстанавіць 8-гадзінны рабочы дзень для работніц больніц. З новага бюджэтнага году ўвесьці асобную санітарку для радзільнага аддзяленьня. Зрабіць вентылятары. Пры консультацыі на летні час адбудаваць пляцоўку для лячэньня дзяцей сонечнымі ваннамі. На будучы год дабіцца атапленьня другой паловы памяшканьня, дзе прымаюць хворых.

Чэрвень. **Краўцова.**

БАЧНА ПРАЦА ДЭЛЕГАТАК.

Актыўна ўдзельнічаюць дэлегаткі ў грамадзкім жыцьці вёскі. Гэта вельмі не падабаецца заможнікам і іншым варожым элемэнтам, якія выступаюць супраць дэлегатак. Такіх мы выкрываем праз насьценную газэту. Працуюць дэлегаткі ў розных камісіях і ўстановах.

У гуртку кройкі і шыцьця, арганізаваным пры дапамозе шэфаў, праводзіцца палітвыхаваўчая праца па спэцыяльнай праграме. Гурток выконвае грамадзка-карысную працу, як дарэмная пашыўка адзеньня для бяднейшых вучняў сямігодкі. У далейшым мяркуецца гэты гурток рэарганізаваць у кравецкі каляктыў. Працавалі тыднёвыя сельска-гаспадарчыя курсы для жанчын. У выніку курсаў жанчыны ўзяліся за збор попелу, перачыстку насеньня. Акрамя гэтага будуць закладзены паказальныя грады ў гародах дэлегатак.

В. Забашэвічы, Барысаўскі р-н. **Мр—к.**

Глуск.

У больніцы на адным ложку па 2 хворых.

Санітаркі ходзяць у брудных халатах.

Крама ў Спажывецкай коопэрацыі № 1: вага гразная, у краме № 2 сьмецьця ня ўбіралася за ўсю зіму.

Шмат хібаў у рабоце сталоўкі: Культбытпаход павінен іспрaвіць гэтыя хібы. **Уфлянд Паша.**

▼▼▼▼▼▼▼▼▼▼

Мы ўраджай павялічым.

Вакол машыны арганізоўваюцца вытворчыя аб'яднаньні. Прагналі былога абшарніка, на зямлі гэтай камуна ўтварылася. Дэлегаткі—застрэльшчыкі ў каляктывізацыі. Каляктыўныя гароды зробім узорна-паказальнымі. Шэфы—рабочыя-дапаможнікі ў павышэньні ўраджайнасьці.

Змагары за ўраджай.

Савіч Вольга цьвёрда парашыла перачысьціць насеньне. А сьвёкар стары сьпіць і ў вус ня дзьме. Ледзь расштурхала яна старога, ледзь пераканала ў неабходнасьці перачышчаць насеньне. Нявестка настойлівая. Нічога ня зробіш. Вылез з хаты сьвёкар ды памог Вользе мяшкі з збожжам на воз пакласьці.

Хогаль Мар'я—бяднячка. Яшчэ ў мінулым годзе яна, паслухаўшы агранома, вясною забаранавала ўсё азімае жыта. Заможнікі ўпікалі: „Зусім згіне жыта" — казалі яны. Мар'я ўпарта маўчала да жніва. А ў жніво сама збажына адказала на кпіны—жыта ўрадзіла лепш, чым ва ўсіх суседзяў.

(Жыткавіцкі р-н).

Неразлучны з сельска-гаспадарчай кніжкаю.

Руднянскія жанчыны (Глускі р-н) падкавалі сябе на месячных сельска-гаспадарчых курсах. Сярод 29 слухачоў 10 жанчын наведвалі курсы. І ня толькі лекцыі слухалі яны там, а ўвачавідкі бачылі, як трэба гаспадарыць пановаму, калі наладзілі экскурсію ў малочную арцель, калгас, ветпункт.

На курсах слухачоў сельска-гаспадарчымі бібліятэкамі надзялілі.

„А зараз нам кніжкі, як дыхаць, патрэбны. Мы будзем і „Белрабсялянку" выпісваць, бо многа ў ёй сельска-гаспадарчых парад"—кажуць сялянкі.

Абвясьцілі конкурс.

У Гарадоцкім раёне абвясьцілі конкурс на дэлегацкі сход, які лепш дапаможа выканаць плян пашырэньня пасяўной плошчы і павялічэньня ўраджайнасьці. Дэлегацкі сход, які больш зробіць у гэтай справе, атрымае ва ўзнагароду акучнік.

Першымі пойдзем мы ў каляктывы.

Гарбуз Арына з вёскі Людзяневічы першая ўнесла прапанову на сходзе: „У калгасы аб'яднаемся, беднота і батрацтва. Я першая запісваюся ў калгас".

Падхапіла вёска гэту прапанову. І зараз ў Людзяневічах арганізавана камуна з 12 сямей, а да камуны далучыліся дэлегаткі з сваімі гаспадаркамі.

А Ельскія дэлегаткі парашылі лёнамялку каляктыўна набыць. Выпісаць даручылі сельска-гаспадарчаму таварыству. Неўзабаве прывезьлі лёнамялку. Як убачылі жанкі, якая гэтая вялікая палёгка для іх—арганізавалі лёнамяльнае таварыства з 23-х чалавек. А зараз таварыства мяркуе каляктывам лён засеяць. Перашкаджае цераспалосіца, таму падалі яны заяву ў РВК—просяць адвесьці вучастак зямлі для каляктыўнага засеву лёну.

Дайце нам машыну і насеньне.

І Жыткавіцкія сялянкі ахвочы насеньне лёну перачысьціць, каб лепшы парос быў, каб зяльлё ня глушыла і менш поліва было. Але што ты тут зробіш, калі на ўвесь раён толькі адна машына для перачысткі лёнанасеньня.

„Дайце нам машыну",—клічуць сялянкі.

У культурна-бытавы паход Халапеніцкія дэлегаткі тлумачылі. „Трэба чысьціць насеньне, слухаць парад агронома". А пасьля парашылі паказальныя гароды арганізаваць, каляктывам апрацаваць іх пад кіраўніцтвам агранома. Жаданьне карыснае, але ёсьць перашкода: насеньня гародняга няма. Трэба камусьці паклапаціцца аб гэтым.

Шэфы на дапамогу. Агранома ня бачым.

Сумуе без агранома вёска Раўнапольле. І вачэй не пакажа аграном. Добра, што шэфы прышлі ў дапамогу—усім растлумачылі як трэба да сяўбы рыхтавацца.

А жанкі вайсковых у Жыткавічах сабралі грошы, закупілі: плуг, акучнік, барану, двое грабель, дзьве рыдлёўкі і перадалі гэта ў падшэфную вёску, частку беднаце, а частку ў машыннае таварыства.

Вось як працоўныя жанчыны дапамагаюць выканаць заклік партыі аб павышэньні ўраджайнасьці.

В. Х.

Скарыстаны допісы: Ліцьвінавай, Кіндзерскай, Альтшулер, Шэйка Марылі, Жураўлёвай, Чабор, „Дэлегаткі".

Ад хворай каровы дрэннае малако.

Якое малако лічыцца дрэнным.

Горкае малако.

Бывае малако па выгляду натуральнае, нават пры гатаваньні не адкіпвае, але на смак горкае. Горкае малако бывае ад таго, што карова есьць шмат горкіх траў, як напрыклад, палын, гарохавая салома, розныя горчакі, папсаваная макуха, рэпа і г. д. Палепшыць гэтае малако лёгка—трэба толькі дрэнны корм замяніць сьвежым сенам і мешанінай з мукі. Бывае, што горкае малако мае яшчэ і жоўтаваты колер, прычына гэтага—хвароба печані і некаторыя хваробы ў страўным шляху каровы. У гэткім выпадку лепш зьвярнуцца за парадай да вэтэрынара. Найчасьцей горкае малако бывае ў старадойных кароў.

Чырвонае малако.

Чырвонае малако бывае ад таго, што карова многа есьць морквы. Каб гэтага ня было, трэба разнастаіць корм. Але бывае, што малако мае чырвоны колер ад розных хвароб вымені, а таксама і ў кароў, захварэўшых на „крываўку". Пры хваробе вымені малако набывае чырвоны колер ад разрыву дробных крывяносных трубачак у вымені. У такіх выпадках трэба лячыць карову, зьвярнуўшыся за парадай да вэтэрынара. Чырвонае малако часамі залежыць яшчэ ад павялічанага прыліву крыві да вымені, пры абгуле кароў альбо пасьля ацёлу; праз тыдзень-другі ён сам сабою зьнікае, пры поўным і асьцярожным выдойваньні. Таксама паша па лесе і розны смалісты корм можа выклікаць чырвоны колер малака.

Сіняе малако.

Спачатку ў малацэ зьяўляюцца толькі маленькія сінія плямы, якія праз нейкі час павялічваюцца і малако прымае сіні колер. Такое малако ня можна есьці ня толькі людзям, але таксама і цялятам, бо ад яго могуць вынікаць хваробы жывата.

Прычынай сіняга малака зьяўляецца асобны грыбок (цьвіль), які бывае ў вільготных памяшканьнях (асабліва вясной ці мокрым летам), у брудных і душных хлявох. Гэтыя грыбкі з паветру падаюць і ў малако.

Каб пазбавіцца ад сіняга колеру малака, трэба зьнішчаць гэтыя грыбкі, а гэтага можна дасягнуць добра ачысьціўшы хлеў, абмыць сьцены і падлогу гарачым лугам, прыбавіўшы на вядро лугу шклянку-дзьве крэоліну. Вымя кароў, ад якіх бывае сіняе малако, трэба абмыць борным квасам (на шклянку цёплай вады ўсыпаць чайную лыжку борнай кіслаты).

Сьлізіста-цягучае малако.

Такое малако бывае ад пападаньня ў выдаенае малако заквашваючых (брадзільных) грыбкоў. Грыбкі гэтыя бываюць у гнілых і цьвілых харчах. Такое малако бяз ніякага смаку, дрэнна скісае, трудна зьбіваецца ў масла і калі пастаіць дзень-два, то робіцца густым і цягучым. У лепшым выпадку яно цягнецца, як ніткі, і падобна да сьлізі. Паправіць такое малако лёгка. Ня трэба даваць карове гнілога корму, а ў хляве зрабіць ачыстку і дэзынфэкцыю.

Жоўтае малако.

Жоўтае малако выклікаюць тыя-ж прычыны, што і сіняе (грыбкі). У ім таксама спачатку зьяўляюцца толькі маленькія жоўтыя плямы, якія павялічваюцца ўсё больш, і больш і малако робіцца жоўтым. Гэты колер нават не прападае, калі малако і згатаваць. Жоўтае малако шкодна для ўжываньня, як і сіняе. Паправіць яго можна тым-жа спосабам, як і сіняе.

Пескаватае малако.

Такім малако завецца тады, калі ў ім знаходзіцца малочны пясок, які ў выглядзе фосфарнакіслай вапны выдзяляецца з малака. Часта пескаватае малако бывае і ад таго, што малако ссыхаецца ў саскох і потым, як які цьвёрды пясок выдзяляецца ў першых порцыях малака пры даеньні.

Карову, якая дае пескаватае малако, належыць даіць асьцярожна, каб не параніць часамі з сярэдзіны саскі; найлепш даіць такую карову праз даільную трубачку.

Аб тым, як трэба правільна даіць кароў і абыходзіцца з малаком, пагаворым у наступны раз.

Вэтэрынарны ўрач **М. Жарын.**

Сьвята першай баразны.

5-га красавіка ў саўгасе Прылукі дэлегаткі замест сьвята „вялікадзень" арганізавалі сьвята савецкіх палёў. З васьмі гадзін раніцы пачалі рыхтавацца да запашкі. Арганізована сустракалі гарадзкіх шэфаў, прыехаўшых праводзіць супольна вялікае сьвята, і пад грукат музыкі пачалася каляктыўная праца.

Сяляне таксама прымалі ўдзел, сярод іх былі дзяды гадоў па 60. Але-ж трэба падкрэсьліць, што яшчэ ня ўсе дэлегаткі адмовіліся ад рэлігійных забабонаў. Частка з іх баялася адыходзіць ад царкоўнай агарожы. Лепшая частка дэлегатак і перадавых працоўных сялян і сялянак будуць прыкладам для адсталай часткі.

Няхай жыве сьвята *„Першай баразны"* савецкіх палёў. Прэч рэлігійны дурман.

Сярыцкая.

Сьвята першай баразны ў саўгасе „Прылукі".

ШТО ТАКОЕ РАДЫЁ

Адным з найвялікшых дасягненьняў чалавека ў галіне тэхнікі зьяўляецца радыё.

У СССР радыётэлефон, параўнаўча, нядаўна мае вялікае распаўсюджваньне, але зараз мы ня маем ніводнага гораду, дзе ня было-б прыёмніку, а ў вялікіх гарадох шырокавяшчальных радыёстанцый.

Радыё не патрабуе ні дроту, ні слупоў. Радыё могуць адначасова слухаць дзесяткі, сотні людзей.

Адлегласьць вёсак ад гарадоў не дае магчымасьці сваечасова атрымаць весткі поштай. Часта пра новыя законы і пастановы ўраду ведаюць толькі праз шмат дзён і тыдняў.

А калі ёсьць у вёсцы радыёприёмнік—усе навіны па Саюзу і па ўсяму сьвету вёска зараз-жа ведае.

Ці яшчэ прыклад: аграном чытае ў Менску гутарку па сельскай гаспадарцы. Каму з сялян ня цікава паслухаць гэты даклад? У Менск паслухаць даклад не паедзеш. Паміж тым, ня выходзячы з хаты, можна слухаць, маючы радыёприёмнік. Адбываецца зьезд Саветаў, у вёсцы можна па радыё ведаць, што за пытаньні вырашаюцца на ім і якія вынесяны пастановы. Радыё дае магчымасьць прымаць вельмі карысныя для сялян весткі аб пагодзе, аб цэнах і г. д. Акрамя таго, у канцы радыё пачастуе музыкай.

Каб пазнаць, што такое радыё і як яно працуе, трэба ўявіць сабе—як перадаюцца гукі чалавечага голасу, стрэл стрэльбы, звон і г. д. на далёкіх адлегласьцях і без усялякіх прыстасаваньняў.

Калі мы ўявім сабе гэта пытаньне, тады лягчэй будзе зразумець, што такое радыё і як яно працуе.

Хвалі.

Вазьміце каменчык і кіньце яго ў спакойна стаячую ваду. Вы ўбачыце, як пойдуць невялікія хвалі (уздрыгі гэтай вады), якраз на тым мейсцы, куды папаў гэты каменчык. Значыць, мы прымусілі ваду рухацца. Гэты рух вы бачыце сваімі вачыма. Гэта вадзяныя хвалі.

Праз паветра таксама мажліва перадаць штуршок. Напрыклад, вы мусіць бачылі, калі моцна штурхнеш дзьверы пры ўваходзе ў хату, ці хутка іх зачыніш, дык дрэнна зачынянае вакно расчыніцца.

Чаму вакно расчынілася ў той час, калі ніхто ня падыходзіў да ваконнай рамы?

А таму, што дзьверы штурхнулі паветра, якое знаходзіцца ў хаце, а паветра ў сваю чаргу штурханула вакно і расчыніла яго.

Вось гэта паветра перадае і гукі з аднаго мейсца ў другое.

Гэта адбываецца так:

Часткі паветра, якія былі каля дзьвярэй, атрымалі штуршок, які перадалі яго сваім суседзям і нарэшце штуршок, дайшоўшы да вакна, адчыніў яго.

Калі мы чуем звон звана, дык гэта таксама адбываецца пры дапамозе частак паветра, павятровых хваль, бо язык звана б'е аб край, край звана пачынае дрыжэць і гоніць павятровую хвалю



Радио в доме рабочего деревообделочника.

і мы чуем на значнай адлегласьці звон.

Паветра ёсьць газ і, ня гледзячы на сваю лёгкасьць, ён давіць, рухае і перадае штуршкі.

Паветра знаходзіцца над зямлею слоем каля пяцісот кілёмэтраў у таўшчыню; вышэй паветра няма. Але акрамя паветра ёсьць яшчэ адна нявідавочная вокам матэрыя, якая завецца эфірам. Эфір гэты ў некалькі мільёнаў разоў лягчэй паветра. Эфір маецца ўсюды, ён напаўняе ўвесь сьвет, ён маецца паміж зямлёю і сонцам і маецца ўва ўсіх рэчах на зямлі.

Як штуршкі па вадзе гоняць вадзяныя хвалі, а штуршкі ў паветры гоняць павятровыя хвалі, так *і штуршкі ў эфіры робяць электрычныя хвалі альбо інакш кажучы радыё-хвалі.*

Гэтыя хвалі перадаюць словы, музыку на шмат тысяч кілёмэтраў. *У гэтым фактычна і ёсьць сутнасьць радыё.* Наша вуха пабудавана так, што яно чуе толькі павятровыя хвалі, а не радыё-хвалі.

Як-жа быць? Як-жа выкарыстаць такія радыё-хвалі?

А робіцца гэта наступным парадкам: павятровыя хвалі на радыёвяшчальнай станцыі перарабляюцца ў радыё-хвалі, якія разыходзяцца па эфіры ва ўсе бакі на тысячы кілёмэтраў. На прыёмнай станцыі гэтыя хвалі ізноў перарабляюцца ў павятровыя, і тады мы чуем, што гавораць, пяюць ці граюць за тысячу кілёмэтраў ад нас.

Як адбываецца перадача гукаў па радыё.

Такім чынам радыё-станцыямі па ўсім напрамкам на тысячы кілёмэтраў перадаюцца гутаркі, радыёгазэты, канцэрты і г. д.

Перадаючая радыё - станцыя складаецца з мікрафону, перадатчыка і антэны.

Антэнай завецца — адзін альбо некалькі дротаў, пераважна медных, якія вісяць на досыць высокіх слупох.

Мікрафон — гэта апарат, які прымае паветравыя хвалі. У ім маецца тонкая вугальная пласьцінка і вугальны парашок.

Пласьцінка дрыжыць ад кожнай паветранай хвалі і зьмяняе плотнасьць вугальнага парашку. Калі перад мікрафонам гавораць, ці грае музыка, дык у паветры

робяцца паветраныя хвалі. Хвалі гэтыя робяць пры гутарцы—голас чалавека, а ў музыцы—дрыжэньне струманту ці частак яго. Гэтыя хвалі калышуць пласьцінку мікрафона. А праз мікрафон, увесь час цячэ электрычны ток. Моц гэтага току зьмяняецца ад таго, больш ці менш націскае на вугальны парашок пласьцінкі, пад уплывам паветраных хваль.

Такім чынам мікрафон зьяўляецца як быццам маленькай фабрыкай, у якой перарабляюцца гукі ў электрычныя хістаньні. Гэтыя хістаньні перадаюцца ў перадатчык, а адтуль яны праходзяць у антэну, а з яе ўжо па эфіру бягуць радыё-хвалі ва ўсе бакі на тысячы кілёмэтраў. У розных гарадох і вёсках стаяць на шляхох гэтых хваль тысячы прыёмных радыё-станцый. На гэтых станцыях радыё-хвалі перарабляюцца ў паветраныя і перарабляе іх тэлефонная трубка, яна робіць тое, што і мікрафон, але ў адваротным напрамку. А робіцца гэта так: Антэна прыёмнай радыёстанцыі атрымлівае з эфіру радыё-хвалі і перадае іх у прыёмнік. Прыёмнік гэтыя хвалі перадае ў тэлефонную трубку і наша вуха чуе ў тэлефоне тыя самыя гукі, словы альбо музыку, якія адбываюцца перад мікрафонам на перадаючай станцыі. Так адбываецца па радыё перадача гукаў бяз дроту на тысячы кілёмэтраў і ў тысячы месц.

А. Комар.

▼▼▼▼▼▼▼▼▼

ВЫВУЧАЙЦЕ НАШЫ ЗАКОНЫ.

Тая палеміка, якая ўзьнікла ў сувязі з карэспандэнцыяй Зоркай у „Беларускай вёсцы", сьведчыць аб тым, што насельніцтва кепска ведае як самыя законы аб абавязках бацькоў у адносінах да дзіцяці, так і іх сэнс.

Паспрабуем некалькі высьветліць гэта пытаньне ў сувязі з тымі прапановамі, якія ўнесьлі сялькоры.

Чаму павінен плаціць дзіцяці толькі мужчына? Трэба, каб плаціла жанчына таксама. Паглядзім, што па гэтаму пытаньню сказана ў законе і ці трэба яго мяняць.

Артыкул 56 кодэксу аб шлюбу: „Бацькоўскія абавязкі ляжаць аднолькава на абоіх бацькох".

Артыкул 64: „Абавязак даваць утрыманьне дзецям ляжыць на абоіх бацькох у роўных частках. Аднак гэтыя часткі могуць быць зьменены ў залежнасьці ад матар'яльнага становішча бацькоў, а калі бацькі жывуць асобна, таксама і ў залежнасьці ад таго, пры кім з іх дзеці знаходзяцца і хто асабліва клапаціцца аб іх выхаваньні".

Такім чынам, калі бацька будзе трымаць дзіця пры сябе, а матка матар'яльна забясьпечана, дык матка і будзе плаціць аліменты. Але з прычыны таго, што найчасьцей бывае наадварот, дзіця застаецца пры матцы, дык і плаціць прыходзіцца бацьку.

Узьнікае другое пытаньне: пры кім павінна застацца пасьля разводу дзіця—пры бацьку ці пры матцы. І мы чуем нараканьні на тое, што нібы закон патрабуе, каб дзіця засталося абавязкова пры матцы. Гэта зноў не адпавядае сапраўднасьці.

Артыкул 58 гэтага-ж закону: „Калі бацькі ня жывуць разам, дык ад іх згоды залежыць пры кім павінны жыць непаўнагодкі дзеці. Пры адсутнасьці згоды—пытаньне вырашаецца судом".

Асабліва цікавы артыкул 53: „Бацькі маюць права вымагаць праз суд сваіх дзяцей ад кожнай асобы, якая затрымлівае дзяцей у сябе. Суд пры разглядзе пытаньня ня зьвязан фармальна правамі бацькоў і вырашае пытаньне ў кожным выпадку, маючы мэтай інтарэсы дзяцей і ўмовы іх нармальнага разьвіцьця і выхаваньня".

Закон, такім чынам, ня толькі не патрабуе, каб дзіця заставалася абавязкова ў маткі, але, калі суд нават прызнае, што дзіцяці будзе лепш пры зусім чужых людзях, ён ім прысуджвае дзіця.

Жанчыне—кажуць апаненты—выгадна вешацца на шыю і раджаць дзяцей таму, што яна атрымлівае аліменты. Супроць гэтага зацьверджаньня сьведчыць усё растучая колькасьць абортаў і наша судовая практыка. Ніколі суд ня прысуджвае, каб абагаціць матку дзіцём. Ён прысуджвае пражытачны мінімум дзіцяці, гэта значыць столькі, каб дзіця магло жыць. Матка-ж дзіцяці плаціць сваім здароўем, працаздольнасьцю, слабодаю таму, што дзіця зьвязвае яе па рукам і нагам, і цяжка дапусьціць, каб можна было паквапіцца на аліменты.

Трэба—кажуць—выдаць такі закон, каб спыніць распусту. Мы згодны. Але закон аб аліментах і зьяўляецца такім законам. Чым даражэй будзе распуста, чым больш за яе прыдзецца плаціць, тым хутчэй яна зьнішчыцца.

Нельга сказаць, каб наш закон аб шлюбу не патрабаваў зьмен. Зьмены патрэбны і яны будуць. Але ня ў тым напрамку, які прапануюць ворагі аліментаў.

Зьмены гэтыя паставяць сваёй мэтай палепшаньне становішча жанчыны і скарачэньне ліку бяспритульных дзяцей. А для гэтага трэба зьнішчыць цеганіну ў аліментных справах і ўтварыць такі закон, каб ня трэба было ганяцца за бацькай дзіцяці па ўсяму Савецкаму Саюзу.

Гарт.

Увага: У наступным нумары рэдакцыя зьмесьціць заключны артыкул, на падставе ўсіх маючыхся допісаў з месц і думку рэдакцыі.

▼▼▼▼▼▼▼▼▼

ПАРАДЫ ГАСПАДЫНЯМ

Винегрет мясной, рыбный и из одних овощей.

Винегрет можно делать из всяких остатков мяса и рыбы или из одних овощей. В винегрет кладется холодный вареный картофель, печеная или вареная свекла, вареная морковь, репа, вареная фасоль, томаты (помидоры), всякие соленые грибы, соленые или свежие огурцы, зеленый или репчатый лук, кислая шинкованная или (кислая же) нарезанная кочанная капуста. Все это предварительно нужно мелко нарезать и хорошенько перемешать или же разложить на блюдо отдельными кусочками.

Мясо и рыба режутся мелкими полосками, можно класть также и селедку.

Здесь перечислено все, что можно положить в винегрет; каждая хозяйка может класть, что найдется у нее, и притом одного можно положить больше, другого меньше.

Красиво подать винегрет зависит от вкуса хозяйки. Никогда не следует класть рядом продукты одного цвета, а подобрать так, чтобы один цвет подходил к другому, если же все продукты вместе, то они кладутся горкой и обливаются подливкой. Кругом можно убрать зеленым луком или салатом, шинкованной красной капустой.

Лапша грибная.

5—6 сухих грибков вымыть, налить холодной водой и оставить в воде часа на четыре. Потом поставит вариться, добавив холодной воды 4—5 тарелок и соли по вкусу.

Пока грибы варятся, сделать лапшу. Для лапши замесить крутое тесто на 1/2 стакана воды и щепочку соли. Месить пока будет отставать от рук; потом раскатать очень тонкий блин, разрезать его полосами и нашинковать тонко лапшу.

Когда грибы сделаются совсем мягкими, вынуть их из бульона, нарезать мелко и положить 1-2 столовых ложки растительного масла; всыпать мелко-нарезанный лук (1—2 луковицы), прожарить, следя, чтобы лук не подгорел, переложить в бульон. Когда вскипит, всыпать лапшу, дать покипеть, пока вся лапша всплывет на верх, и подавать.

Оладьи с яблоками.

Приготовить тесто из 4 стаканов муки, 2 стаканов теплого молока (или воды) и 10 гр. дрожжей.

Когда тесто поднимается, положить 2 яйца, 1 чайную ложку соли и столько же сахара, выбить хорошенько и дать подняться

Перед самым печением очистить и нарезать тоненькими кусочками (без сердцевины) 3 яблока, положить в тесто, осторожно размешать. На сковородке раскалить сало или подсолнечное масло, брать тесто ложкой и класть на сковородку. Когда поджарится с одной стороны, перевернуть на другую и поджарить.

Подавать горячими, обсыпав сахаром.

„Белрабсялянку“ ў глухія куткі.

Раней нашы жанчыны нават ня ведалі аб часопісі, а зараз 12 дэлегатак падпісаліся на „Белрабсялянку“. Мы спадзяемся азнаёміць і распаўсюджваць нашу часопісь сярод самых адсталых жанчын.

Для мяне зьяўляецца вялікай радасьцю, калі цёмная жанчына пачынае цікавіцца часопісьсю. Усяго 2 гады назад я таксама была цёмная. Але дэлегацкі сход, лікпункт і часопісь мяне многаму навучылі. Мне 29 год, але я зараз наведваю заняткі партшколы, заўсёды бываю на дэлегацкіх сходах. Звычайна на сходах мы чытаем нашу „Белрабсялянку“. Такія чыткі даюць нам многа карысных ведаў.

Уфлянд.

Глуск.

САЧЫЦЕ ЗА ЎМОВАМІ ЛЁТАРЭІ!

РАЙЖАНОРГІ,
ХУТКА ПРЫШЛІЦЕ КОЛЬКАСЬЦЬ ПАДПІСЧЫКАЎ У ВАШЫМ РАЁНЕ.

У ЯКІМ РАЁНЕ БОЛЬШ ПАДПІСЧЫКАЎ—
АТРЫМЛІВАЕ АДНЫ ЛЕТНІЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ПАЛЯВЫЯ ЯСЬЛІ

АТРЫМЛІВАЙЦЕ 10% ЎЗНАГАРОДУ

САЧЫЦЕ за нумарамі лётарэйных білетаў, якія друкуюцца ў „Бел. Раб. і Сялянцы“.

ПОЎГАДАВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ!

У ЧЭРВЕНІ КАНЧАЕЦЦА ТЭРМІН ВАШАЙ ПАДПІСКІ

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ СВАЕЧАСОВА ПАДПІСАЦЦА

на „БЕЛАРУСКУЮ РАБОТНІЦУ і СЯЛЯНКУ“

Правільным харчаваньнем — папярэдзім хваробу.

Як вылічваць колькасьць неабходных харчоў на кожнага едака хатнім гаспадыням.

У мінулы раз мы з вамі гутарылі аб тым, якая колькасьць і якасьць яды ў калёрыях патрэбна працаўнікам сярэдняй і важкай работы. Зараз мы з вамі паслухаем, як кожная хатняя гаспадыня павінна вылічваць колькасьць неабходных прадуктаў.

Назва прад.	Сярэдняя работа	Цяжкая работа
Хлеб чорны	800 гр.	1200 гр.
Крупа	50 „	120 „
Бульба	400 „	600 „
Капуста	300 „	450 „
Памідоры	100 „	150 „
Морква	30 „	40 „
Цыбуля	30 „	40 „
Масла альбо сала	60 „	100 „
Мяса	200 „	200 „
Малака (1 шклянка)	200 „	200 „
Яйкі (1 штука)	50 „	50 „
Цукру	40 „	40 „
Фруктаў	200 „	200 „

Прычым, першая колькасьць харчоў (для сярэдняй работы) падыходзіць для большасьці самастойнікаў і фабрычна-заводзкіх рабочых. Для больш цяжкіх работ датычацца рабочыя капалень, малатабойцы, муляры і кавалі. Вядомая рэч, што кожная хатняя гаспадыня можа ў той ці іншай колькасьці зьмяніць сорт прадуктаў, напрыклад: замест бульбы павялічыць колькасьць капусты ці іншай гародніны; замест круп можна скарыстаць локшаны альбо вермішэль; замест мяса рыбу альбо птушак. Павялічыць колькасьць мяса ня варта, бо, як мы ўжо у мінулым разе гаварылі, і пры цяжкай працы многа мяса ня дужа карысна, бо, ў мясу няма вугляводаў, крахмалу і цукру. Вылічваючы колькасьць прадуктаў для усёй сям'і, трэба мець на ўвазе выконваемую працу і ўзрост. Дзеці ад аднаго да трох гадоў павінны зьесьці трэцьцю частку дарослага сярэдняй працы, дзеці ад 6—10 гадоў палову, падлеткі ад 16—18 гадоў павінны зьесьці поўную сярэднюю колькасьць.

Кіруючыся у сярэднім колькі патрэбна на аднаго чалавека, хатняя гаспадыня можа карысна гатаваць абед, каб было танна, смачна і дабра-якасна.

Д-р *Каплан.*

Паштовая скрынка.

Элькиной—Бобруйск—Послан ответ письмом.

Делегатке—ф-ка „Спартак"—Одну заметку использовали. О выговоре печатать не будем. Пишите об участии работниц в социалистическом соревновании.

Жуковин—Бобруйск, стеклозавод. Выговор администрация имеет право давать. Из вашей заметки не ясно, кто прав. Если работница не согласна, она должна этот выговор опротестовать. Напишите о постановке трудовой дисциплины у вас на заводе.

Рудиной—Витебск. Освещайте один факт более подробно. У вас материал отчетно-цифровой.

М. Асоту—Ваш допіс адаслан у Сьмілавіцкі Райком КСМ. Успаміны не падыходзяць.

М. Чабору—Допіс аб шэфах скарыстаем. Астатнія—агульныя разважаньні.

Мацыновіч—Аб Гарадоцкай консультацыі ўжо пісалі.

Дунтаў—У вашым допісу нічога канкрэтнага. Друкаваць ня будзем.

Зарэцкай—Адзін допіс друкуем. Другія не падыходзіць.

Альтшулер—Ня пойдзе.

Кананучанка—Калі факты на судзе не падцьвердзіліся, можна на месцы падабраць матар'ял і падаць на паўторны разгляд у суд.

Уфлянд П.—Адзін допіс скарысталі. Астатнія не падыходзяць. Пішэце, як працуюць гурткі прыхільнікаў часопісі.

Махноўскай Марылі—ня пойдзе.

Высоцкой—Дополнительно выслать журнал за прошлое не можем. Возобновите подписку и будете иметь 3 талона на участие в лотерее.

Бараноўскай—Ня пойдзе. Пішэце, як праводзіцца штодзённая антырэлігійная праца сярод жанчын.

Горелик—Быхов—послан ответ в Райком КПБ—женотдел.

Гинзбург—Не пойдет, подходит для стенгазеты.

М. Чабору-Миловерову, Я. Кручкову—Вершы друкаваць ня будзем. Слаба апрацаваны.

Выражце гэты білет, напішэце на ім сваё прозьвішча, імя, адрас і тэрмін падпіскі
І РАЗАМ З КВІТКОМ НА ЗДАЧУ ПАДПІСКІ
перашліце ў рэдакцыю часопісі
„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА"
Менск, Савецкая 45.

Лётарэйныя білеты пачалі друкавацца ў нашай часопісі з сакавіка месяца, але права на ўдзел у лётарэі маюць толькі тыя, хто падпісаўся на „БЕЛРАБСЯЛЯНКУ" ў час з 1-га студзеня да 1-га мая, ня менш як на 3 месяцы.

3-х месячныя падпішчыкі перасылаюць у рэдакцыю (разам з квітком на здачу падпіскі) . . 1 білет.
Паўгадовыя . . . . . 2 білеты.
Падпішчыкі на 9 месяцаў . . . 3 білеты.
Падпішчыкі на год . . . . . 4 білеты.

Каляктыўныя падпішчыкі прысылаюць адразу ўсе білеты з агульным квітком на здачу падпіскі.

Перасылка лётарэйных білетаў павінна быць аплачана маркамі, даплатныя—выкупляцца ня будуць.

Лётарэйны білет №

НА ПРАВА ЎДЗЕЛУ Ў ВЯЛІКАЙ ЛЁТАРЭІ ЧАСОПІСІ „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА".

Прозьвішча і імя .....

Паштовае аддзяленьне .....

Акруга .....

Раён .....

Вёска .....

Тэрмін падпіскі .....

Выдавец—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары* **С. Крэмер. М. Меерзон.**

Менск, друкарня БДВ Заказ № 2767. У ліку 13.600 экз. Галоўлітбел № 1650.